На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 210 (792)
Пятніца, 12 лістапада 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 25000 руб., па падпісцы — 18000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Ідзе падпіска на першую палову 2000 года.
Застаёмся разам!

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

ОСВЕТИТЕЛЬНОЕ ОБОРУДОВАНИЕ ЛАМПЫ КАБЕЛЬ
К и К
8-(017)-213-70-21
8-(017)-213-70-13
Кальченко & К°

Факт

Во время встречи с главой рабочей группы Парламентской ассамблеи ОБСЕ Адрианом Северином Лукашенко сообщил, что по мнению властей, Юрий Захаренко в настоящее время живет в Украине, Виктор Гончар — в России, а Тамара Винникова — на Западе. Об этом говорится в отчете о встрече, распространенном в Вене Консультативно-наблюдательной группой ОБСЕ.

Комментарий

Где они — Захаренко, Гончар и Винникова?

А где, позвольте поинтересоваться, доказательства? Четко и уверенно произнесенные слова — это одно. Реальные же факты — совершенно иное.

А.Лукашенко утверждает, что Захаренко, Гончар и Винникова живут и здравствуют на территории других государств. Допустим. Тогда странно, что об этом ничего не знают в тех странах, которые назвал Лукашенко. Нет такой информации и у их родственников, друзей, соратников, знакомых в конце концов. И почему свои слова А.Г. никак не проиллюстрировал? Неужели в ту же Россию или Украину так проблематично отправить парутройку сотрудников спецслужб, которые на фото- или видеопленку запечатлели бы, как Юрий Николаевич, Виктор Иосифович и Тамара Дмитриевна с кем-то встречаются, о чем-то договариваются или просто прогуливаются по мостовой или, довольные жизнью и положением вещей, пьют кофе? Тогда, демонстрируя разоблачающие происки оппозиции кадры не только Западу, но и каждому жителю Беларуси, А.Лукашенко мог бы вообще ничего не говорить. Все ясно было бы и без слов.

Опять же, наши люди есть везде. Но до сих пор почему-то не нашлось ни одного туриста, иностранца, папарацци, политика, просто сочувствующих или переживающих, которые общались хотя бы с одним из исчезнувшей троицы...

Люди здравомыслящие знают, что А.Лукашенко, скорее всего, никогда не сможет предоставить широкой общественности такие кадры (по крайней мере в отношении того же Захаренко): он-то наверняка хорошо знает, где, когда и по каким причинам были, мягко говоря, "изъяты" из политической и общественной жизни вышеназванные особы. В прошлом, между прочим, высшие должностные лица государства — министр внутренних дел, председатель Центральной избирательной комиссии и председатель Нацбанка Беларуси.

С момента исчезновения Винниковой, Захаренко и Гончара прошло довольно много времени. Но до сих пор — никакой утечки информации. Молчат не только те, кто отдавал распоряжение "устранить". Молчат и те, кто его исполнял...

Кажется, власть предержащим выгодно, чтобы Тамара Дмитриевна Винникова не нашлась. Если она заговорит, обнародует кое-какие документы о финансовых аферах, то автоматически переведет многих влиятельных нынче людей в разряд преступников.

Юрий Николаевич Захаренко тоже не понаслышке знал многие государственные секреты и был в курсе ряда финансовых махинаций. Кроме того, он был опасен еще и потому, что собирался создать Белорусский союз офицеров, альтернативный теперешнему. Союз настоящих офицеров, которые не собираются обслуживать чьи-то "царские" прихоти и замашки, а будут служить Его Величеству Закону и не чувствовать себя зависимыми от вышестоящей дурости.

Что касается Гончара, то он, по мнению многих, был одним из серьезнейших оппонентов Лукашенко и запросто мог представлять опасность его имиджу.

Рискну предположить, что следующей в черном списке неугодных режиму стоит фамилия Лебедько. Слишком уж активно и аргументированно он высказывает свое недовольство нынешней властью. Если, не дай Бог, так и случится, очередной случайностью это уже при всем желании не назовешь...

Марина КОКТЫШ.

Мечаслаў Грыб і Анатоль Лябедзька прадстаўнікі беларускіх парламентарыяў на сесіі Парламенцкай Асамблеі НАТО

11 лістапада ў Амстэрдаме адкрываецца чарговая сесія Парламенцкай Асамблеі Паўночнаатлантычнага альянсу, на якой будуць прадстаўлены парламенты больш як 50 дзяржаў — як тых, што ўваходзяць, так і не ўваходзяць у склад НАТО. Ад парламента Беларусі ў ёй запрошаныя узяць удзел дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га скліканння Мечаслаў Грыб і Анатоль Лябедзька.

Перад ад'ездам у Нідэрланды А.Лябедзька паведаміў карэспандэнту БелаПАН, што прадстаўнікі Вярхоўнага Савета хацелі б выступіць перад калегамі, каб праінфармаваць удзельнікаў сесіі аб цяперашняй палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Праца сесіі завершыцца 15 лістапада.

Уладзімір ГЛОД, БелаПАН.

Памяць

12 лістапада спаўняецца тры гады, як у аўтамабільнай катастрофе (пры нявысветленых да канца абставінах) загінуў Анатоль МАЙСЕНЯ

Майсеня Анатоль Іосіфавіч (4.1.1959 г., в.Вялікая Ліпа Нясвіжскага раёна — 12.11.1996 г.), беларускі палітолаг, журналіст. Кандыдат філасофскіх навук (1987). Скончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1980). Працаваў на Беларускім рэспубліканскім тэлебачанні, быў палітычным аглядальнікам "Народнай газеты". З 1992 года — прэзідэнт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных ініцыятыў "Усход—Захад". Даследаваў гісторыю палітычных рэпрэсій у БССР, сацыяльна-палітычныя працэсы ў канцы 1980-х — 1990-я гады ў Рэспубліцы Беларусь. Загінуў у аўтакатастрофе.

Творы: Забыть не дано. Мн., 1989; Страна несбывшихся надежд. Мн., 1997.

(Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн., 1999.)

З даўніх часоў сярод людзей нашых ходзіць прыказка: "Не купі двара, а купі суседа". Перш чым паставіць новы дом, заўсёды патурбуешся — а хто будзе тваім суседам? Дзяржавы, як людзі, і не менш, чым людзям, дзяржавам патрэбна добрасуседства. Ёсць паразуменне з суседзямі, спакойна на межах — тады і ў дзяржаве можна ўсё на спакойны лад рабіць. І перад незалежнай Беларуссю паўстала цяпер задача заваёўваць на свой бок суседзяў, усталёўваць добрасуседскія сувязі з тымі краінамі, якія маюць агульную мяжу з намі. Але ж ці гатова да гэтага сама Беларусь? Наколькі яе цяперашнія лідэры ўсвядомілі прыярытэтнасць добрасуседства, як яны рэалізуюць гэта ў знешнепалітычнай практыцы?

Па ўсім відаць, не зусім і не лепшым чынам.

Хаатычная знешняя палітыка, якая хутчэй складаецца з канфліктуючых імпульсаў двухтрох яе "галоўных архітэктараў", асабістых амбіцый, чым адпавядае аб'ектыўным нацыянальным інтарэсам Беларусі, — усё гэта прывядзіць да непрыглядная блытаніны і ў адносінах з дзяржавамі-суседзямі. Замест іерархіі прыярытэтаў, дакладна вызначанай палітыкі ў кожным з пяці напрамкаў — Расія, Польшча, Літва, Латвія, Украіна, у залежнасці ад спецыфікі кожнай з пяці суседніх дзяржаў, на самых высокіх узроўнях — бездапаможныя размовы пра роўнае стаўленне да ўсіх, пра адсутнасць усялякіх пераваг і выключэнняў. Каго б гэта ні датычыла.

Замест таго, каб агледзецца навокал, нашы палітыкі і ўрадавыя дзеячы шукаюць партнёраў за сінімі морамі.

Добрасуседства, трывалыя адносіны ўзаемапавагі і ўзаемаразумення з усімі суседзямі — імператыў знешняй палітыкі Беларусі. Гэта бясспрэчна. Але мэта не можа быць дасягнута шляхам штучнага нівеліравання. Тут нельга дзейнічаць на адзін капыл, да кожнага суседа павінен быць індывідуальны падыход, у залежнасці ад яго ўдзельнай вагі на шалях беларускай палітыкі. Нас жа цягне няўмольная сіла інерцыі камуністычнага эгалітарызму.

У аснове формулы добрасуседства ляжаць усведамленне кардынальных перамен у посткамуністычнай Усходняй Еўропе і месца Беларусі ў сістэме каардынат еўрапейскай і сусветнай геапалітыкі. Чым з'яўлялася знешнепалітычнае акружэнне Беларусі да таго, як былі зруйнаваны адзін за адным камуністычныя рэжымы Усходняй Еўропы? Адзіны ўсярэднены, безаблічны фон камуністычнага інтэрнацыяналізму, праз які ледзь-ледзь праглядвалі адметныя рысы нацыянальных інтарэсаў той жа Польшчы ці Латвіі.

Беларусь як частка вялікай дзяржавы была пазбаўлена сваёй знешняй палітыкі. Што ўяўляе сабой знешнепалітычнае акружэнне Беларусі цяпер? Найскладанейшую камбінацыю з нацыянальных інтарэсаў і палітычных памкненняў суседніх дзяржаў, якія, відавочна, далёка не заўсёды ляжаць у адной плоскасці і зусім не абавязкова супадаюць з нацыянальнымі інтарэсамі самой Беларусі. Своеасаблівы паралелаграм сіл. Вось чаму мэта дасягнення добрасуседства выходзіць за межы двухбаковых адносін Беларусі з кожнай з пяці дзяржаў. Яна вызначаецца, па-першае, раўнавагай ці гармоніяй інтарэсаў усіх суб'ектаў у дачыненні да Беларусі, і, па-другое, — гэтыя інтарэсы павінны быць суаднесены з нацыянальнымі інтарэсамі самой Беларусі. Праблема добрасуседства — гэта праблема прапорцый, суадносін, балансу сіл і інтарэсаў. Нельга, напрыклад, "перагружаць" двухбаковыя адносіны Беларусі на пэўных напрамках, бо тым самым мы рызыкуем ссунуць цэнтр цяжару ў нашым знешнепалітычным акружэнні да небяспечнай рысы. А значыць, перакрэсліць агульную перспектыву добрасуседства.

З артыкула А. Майсені "Ці здолее Беларусь авалодаць формулай добрасуседства?", "Звязда", 15—16 снежня 1992 г.

Конкурс на прэмію імя Анатоля Майсені працягваецца

Як вы, шаноўныя чытачы, ведаеце, адразу пасля смерці А.Майсені рэдакцыяй газеты "Народная воля", Беларускай асацыяцыяй журналістаў і Беларускай еўраатлантычнай асацыяцыяй быў аб'яўлены конкурс на прэмію ў яго гонар. Двойчы ўжо падводзіліся вынікі. Пераможцамі станавіліся вядомыя аўтары.

Сёлета конкурс на прэмію імя таленавітага публіцыста, вядомага палітолага, грамадскага дзеяча Анатоля Майсені працягваецца. Вынікі будуць падведзены ў студзені наступнага года.

Беларуская служба "Радыё Свабода"

Новыя хвалі ад 31 кастрычніка 1999 года

Час	кHz	Хвалі
18.00—19.30	6000, 6170, 7155, 9615	49 41 31
22.00—23.30	6010, 6025, 6170 7155	49 41
6.00—7.00	5995, 7275, 7295 9750	49 41 31

Сталая частата на сярэдніх хвалях — 576 кгц

Адрас: 220005 Мінск-5, п/с 111; Vinohradska 1, Praha 110 00 CZ.

Праграму можна слухаць, чытаць, а таксама пісаць у рэдакцыю праз Інтэрнет WWW.SVABODA.ORG

НАСТРОЙЦЕСЯ НА "СВАБОДУ"!

Мікалаю Статкевічу не дазволілі паехаць у Стамбул

Днямі кіраўнік Кансультацыйна-назіральнай групы (КНГ) АБСЕ ў Беларусі Ханс-Георг Вік атрымаў ліст ад Валерыя Коранева — следчага па справе старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалая Статкевіча. У лісце гаворыцца, што ўдзел М.Статкевіча ў выязным пасяджэнні рабочай групы па Беларусі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, што мае адбыцца 17 лістапада ў Стамбуле, немагчымы, бо на гэты час запланаваныя следчыя мерапрыемствы па ягонай справе.

М.Статкевіч быў арыштаваны 17 кастрычніка, пасля "Маршу Свабоды" беларускай апазіцыі, адным з арганізатараў якога ён з'яўляўся. Ён абвінавачваецца паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу РБ: 186-3 (арганізацыя ці актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія парушаюць грамадскі парадак), які прадугледжвае да трох гадоў зняволення, і 196-1 (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання) — да двух гадоў пазбаўлення волі.

31 кастрычніка М.Статкевіч быў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе пасля двухтыднёвай галадоўкі пратэсту. Кіраўніцтва КНГ АБСЕ звярнулася да генеральнага пракурора краіны Алега Бажэлкі з просьбай дазволіць М.Статкевічу выехаць ў Стамбул.

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік КНГ АБСЕ Ханс-Георг Вік пасля таго, як была атрымана адмова ад следчага, накіраваў ліст з аналагічнай просьбай віцэ-прэм'еру — міністру замежных спраў Беларусі Уралу Латыпаву.

Аляксей ЗНАТКЕВІЧ.

Стоп-кадр

81-летняя Аксиния Шашок получает пенсию (6 с небольшим миллионов рублей) из рук деревенского почтальона прямо в сельском магазине.

Фото IREX/ProMedia.

Тры пытанні на мяжы стагоддзяў

Юрась БЕЛЕНЬКІ:

Мы яшчэ пазмагаемся за нашу незалежнасць!

1. Самы значны ўрок XX стагоддзя?
2. Ваш найбольш яркі ўспамін на выходзе стагоддзя?
3. Якой вы бачыце Беларусь трэцяга тысячагоддзя?

1. Традыцыйна такая пастаноўка пытання прадугледжвае вызначэнне пэўнай канкрэтнай падзеі. Без прэтэнзіяў на арыгінальнасць хачу адказаць інакш. Кожны дзень стагоддзя, ад пачатку да апошняга, нясе нам гэты ўрок: нельга стварыць дабро праз зло. Нельга прынесці свабоду і дабрабыт, прыгнятаючы іншыя народы, забіраючы жыцці, свабоду іншых людзей. Самыя яскравыя таму пацверджанні, прыклады стагоддзя — прыход да ўлады пад лозунгамі дабра і справядлівасці найбольш крывавых рэжымаў — расійскага бальшавізму і германскага фашызму.

Сённяшнія прыклады — Расія і Беларусь. Расія, якая па духу і сутнасці застаецца імперыяй, прыгнятаючы іншыя народы і ведучы войны, не мае ні дэмакратыі, ні свабоднага грамадства, ні нармальных умоў жыцця для сваіх людзей. І гэта пры тым, што яна валодае велізарнымі прыроднымі рэсурсамі.

На Беларусі ў 1994 годзе да ўлады прыйшоў рэжым, які не нясе светлай стваральнай ідэі пабудовы вольнай незалежнай дзяржавы, свабоды і дэмакратыі. І мы бачым вынік: міжнародная ізаляцыя, цяжкі стан эканомікі, дэвальвацыя маральных каштоўнасцяў у грамадстве.

Галоўны і вечны ўрок, і не толькі XX стагоддзя: Бог даў чалавеку "інструкцыю" для карыстання жышцём — запаведзі, у аснове якіх ляжаць любоў і дабро. Чым больш чалавек адыходзіць ад гэтай "інструкцыі", тым больш няшчасцяў ён мае.

2. Атрыманне незалежнасці Беларуссю. Пасля стагоддзяў генацыду, фізічнага, этнічнага, духоўнага вынішчэння, паўстанняў, спробаў адрадзіць краіну і дух народа Беларусь стала незалежнай.

Тады, у жніўні 1991 года, пасля надання Дэкларацыі аб незалежнасці статута канстытуцыйнага закона, мы, дэпутаты фракцыі БНФ, выйшлі на галоўную плошчу сталіцы да народа. Навокал сябе я бачыў сапраўды шчаслівых людзей!.. Міжволі ўзгадваюцца словы, сказаныя тады Пятром Садоўскім: "У жыцці я зведаў смак добрага віна, каханне жанчыны і яшчэ шмат таго, што складае паўнату жыцця. Але я думаў, што так і памру, не зведаўшы пачуцця жыць у вольнай Беларусі..."

Мы разумелі, што за нашу незалежнасць яшчэ прыйдзецца пазмагацца, але тады... гэта былі сапраўды яркія і шчаслівыя імгненні.

3. Беларусь будзе вольнай і заможнай. Заўважце, мы, прыхільнікі незалежнасці і адраджэння Айчыны, поўныя аптымізму. І гэты аптымізм мае пад сабой трывалую аснову. Глядзіце, людзі ўсё больш і больш бачаць бесперспектыўнасць фальшывых догмаў сённяшняга рэжыму ў Беларусі і ягоных хаўруснікаў у Расіі. Людзі ўсё больш і больш паварочваюцца да хрысціянскіх каштоўнасцяў. Бог стварыў розныя народы, даў ім розныя мовы, запаведзі, па якіх жыць. І тыя народы, якія шануюць тыя каштоўнасці, дасягаюць росквіту ва ўсіх сэнсах.

Гэта, безумоўна, не значыць, што трэба сядзець і чакаць манны нябеснай. За ідэі трэба змагацца, трэба актыўна супрацьстаяць антычалавечым праявам рэжыму.

І я веру, што рана ці позна наш народ будзе вольным, а краіна — незалежнай.

Рубрыку вядзе Вольга КЛАСКОЎСКАЯ.

Брэсцкая вобласць выйшла на другое месца ў рэспубліцы па колькасці выяўленых ВІЧ-інфіцыраваных

Як паведаміў карэспандэнту БелаПАН загадчык прафілактычным аддзелам Брэсцкага абласнога цэнтра прафілактыкі СНІД Сцяпан Завада, за 10 месяцаў на Брэстчыне было выяўлена 36 інфіцыраваных. Усяго ж у вобласці паражоныя ВІЧ-інфекцыяй 120 чалавек, 3 чалавекі на сённяшні дзень памерлі ад СНІД.

Прырост выпадкаў заражэння ВІЧ-інфекцыяй ў вобласці адбыўся пераважна за кошт асоб, якія ўжываюць наркотыкі ўнутрывенна. Усяго ж такім чынам былі заражоныя 108 чалавек. На жаль, ВІЧ-інфіцыраваныя ў асноўным маладыя людзі. 40 працэнтаў з іх моладзь ва ўзросце 20—24 гадоў, 28 працэнтаў — 25—29 гадоў, 10 працэнтаў — 15—19 гадоў. Большасць вірусаносьбітаў (75 працэнтаў) — мужчыны без пэўных заняткаў, а таксама асуджаныя, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі.

У Брэсцкай вобласці пражываюць 4 ВІЧ-інфіцыраваныя пары, дзе носьбітамі вірусу з'яўляюцца муж і жонка, дарэчы, па віне медыкаў было інфіцыравана адно дзіця.

Сярод гарадоў Брэстчыны лідэрства ў гэтым сумным спісе трымае Пінск, дзе сёлета выяўленыя 28 інфіцыраваных (усяго там пражываюць 70 носьбітаў вірусу), потым ідуць Баранавічы (адпаведна 5 і 18 ВІЧ-інфіцыраваных).

Як лічыць Сцяпан Завада, Брэсцкі абласны цэнтр прафілактыкі СНІД аснашчаны ўсім неабходным для абследавання абсталяваннем, аднак катастрафічна не хапае грошай на прафілактычную працу. Зараз, на думку медыкаў, нельга абмяжоўвацца лекцыямі ў школах і ўлёткамі ў бібліятэках. У прафілактычныя мерапрыемствы павінны актыўна ўцягвацца валанцёры з "трупы рызыкі", члены маладзёжных арганізацый, работнікі школ і ўстаноў культуры.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Сообщение для прессы

5 ноября 1999 года экспертные группы правительства и белорусской оппозиции завершили работу по согласованию условий доступа политической оппозиции к государственным средствам массовой информации на период подготовки переговоров между правительством и оппозиционными политическими партиями. Данные условия были парафированы от имени белорусского правительства Михаилом Сазоновым, а от имени экспертной группы по СМИ от оппозиции г-ном Михаилом Пастуховым.

8 ноября 1999 года Консультативный совет оппозиционных политических партий одобрил протокол согласования условий доступа оппозиции к государственным СМИ. Одобрение соглашения со стороны правительства было направлено 9 ноября 1999 года за подписью В.Д.Дудко, первого заместителя председателя Белтелерадиокомпании Республики Беларусь и В.С.Глушакова, первого заместителя председателя Госкомпечати Республики Беларусь.

По просьбе обеих сторон КНГ ОБСЕ распространяет текст вышеупомянутых соглашений.

8 ноября 1999 года стороны продолжили обсуждение порядка разрешения споров, возникающих в результате возможного несогласия одной из сторон с ходом выполнения вышеуказанных договоренностей. Соответствующий протокол будет парафирован в ходе предстоящей встречи рабочих групп, намеченной на 15 ноября 1999 года.

Консультативно-наблюдательная группа ОБСЕ в Беларуси.

Протокол согласования условий доступа политической оппозиции к государственным СМИ на период подготовки переговоров между правительством и оппозиционными политическими партиями

В соответствии с признанными Республикой Беларусь международными обязательствами в области прав человека, руководствуясь положениями Конституции Республики Беларусь о свободе выражения мнений, политической оппозиции предоставляются следующие условия доступа к государственным СМИ на период подготовки переговоров.

В СФЕРЕ ТЕЛЕВИДЕНИЯ И РАДИО

Национальная государственная телерадиокомпания Республики Беларусь предоставляет политической оппозиции эфирное время:

на телевидении

в информационно-аналитических программах "Палітычныя дыялогі" і "Падзея", в информационной программе "Панарама", а также эфирное время в программах областных телерадиообъединений;

на радио

в политической программе "Разговор по существу", в информационных программах "Радыёфакт" и "Пастфактум-радыё", а также в программах областных телерадиообъединений.

В дальнейшем стороны готовы обсудить вопрос о создании на телевидении и радио новых общественно-политических программ, позволяющих вести в прямом эфире открытый диалог власти и оппозиции, политических партий между собой по насущным проблемам внутренней и внешней политики Республики Беларусь.

Редакции местного радиовещания предоставляют политической оппозиции эфирное время в утренних и вечерних выпусках программ местного радио.

В СФЕРЕ ПЕЧАТИ

Республиканские периодические печатные издания (газеты "Советская Белоруссия", "Народная газета", "Звязда", "Рэспубліка", "Белорусская нива") вводят постоянные рубрики для публикации материалов, предоставленных политической оппозицией.

Данные материалы по возможности равномерно распределяются в указанных периодических печатных изданиях и готовятся к печати в приоритетном порядке.

В отношении местных государственных периодических печатных изданий сохраняется тот же порядок публикации материалов.

Конкретные организационно-технические условия доступа политической оппозиции к государственным электронным средствам массовой информации и печати оговариваются в приложении, которое является неотъемлемой частью настоящего документа.

От правительственной стороны
Подписано: Сазонов
От оппозиционных политических партий
Подписано: Пастухов

Приложение

Организационно-технические условия доступа политической оппозиции к государственным средствам массовой информации

Политической оппозиции предоставляется:

Национальной государственной телерадиокомпанией Республики Беларусь эфирное время в следующих информационных программах:

ТЕЛЕВИДЕНИЯ

— **"Палітычныя дыялогі"** — один раз в неделю (четверг);

— **"Падзея"** — два раза в неделю.

Состав участников этих программ, а также дни выхода в эфир программы "Падзея" определяются Консультативным советом оппозиционных политических партий не позднее чем за четыре дня до эфира. Тематика передач предлагается Консультативным советом оппозиционных политических партий и согласовывается с уполномоченными представителями Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь.

Передачу ведет автор программы либо автор совместно с другим журналистом, кандидатура которого согласована с ее участниками. Возможно осуществление диалога самими участниками программы.

Если в передаче участвуют представители от правительства и политической оппозиции, ведущий обязан обеспечить равные возможности для выступления ее участникам.

Редактирование передач допускается с согласия участников. По желанию любой из сторон пленка, готовая к выходу в эфир, может быть предварительно просмотрена.

— В передаче **"Панарама"** предоставляется право для ежедневных сообщений до 1,5 минуты.

Сообщения предоставляются в виде текстовых и (или) видеоматериалов ежедневно до 17.00 уполномоченными на то лицами от Консультативного совета оппозиционных политических партий соответствующим должностным лицам Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь.

Предоставляемые материалы согласовываются уполномоченными лицами от Консультативного совета оппозиционных политических партий и Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь.

РАДИО

— **"Разговор по существу"** — один раз в неделю (пятница).

Состав участников программы определяется Консультативным советом оппозиционных политических партий не позднее чем за четыре дня до эфира. Тематика передач предлагается Консультативным советом оппозиционных политический паттий и согласовывается с уполномоченными представителями Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь.

Если в передаче участвуют представители от правительства и политической оппозиции, ведущий обязан обеспечить равные возможности для выступления ее участникам, в том числе и с учетом телефонных обращений.

— В программах **"Радыёфакт" и "Пастфактум-радыё"** предоставляется право для ежедневных сообщений до 5 минут в каждой программе.

Запись участников указанных программ осуществляется не позднее чем за день до эфира.

Редактирование передач допускается с согласия участников. По желанию любой из сторон пленка, готовая к выходу в эфир, может быть предварительно прослушана.

Вопрос о доступе к эфиру и размещении материалов **в программах областных телерадиообъединений** решается по согласованию уполномоченных лиц от Консультативного совета оппозиционных политических партий и Национальной государственной телерадиокомпании Республики Беларусь.

ПЕЧАТЬ

Право публикации материалов в соответствующих рубриках на страницах следующих **республиканских периодических печатных изданий** — "Советская Белоруссия", "Народная газета", "Звязда"; "Рэспубліка" и "Белорусская нива".

Материалы от политической оппозиции публикуются не менее двух раз в неделю.

Объем материала не должен превышать 250 газетных строк.

Данные материалы готовятся к печати в приоритетном порядке и публикуются, как правило, не позднее чем через два выпуска газеты.

Без согласия автора внесение в текст поправок, искажающих содержание материала, не допускается.

Размещение материалов на газетных полосах происходит с учетом актуальности поднятой в них проблематики.

БелТА через свои каналы передает официальную и иную согласованную руководителями от правительства и политической оппозиции информацию.

Материалы должны быть завизированы уполномоченным на то представителем Консультативного совета оппозиционных политических партий, автором материала и сопровождаться для возможной совместной работы реквизитами автора (фамилия, имя, отчество; почтовый адрес, телефон).

В местных и иных государственных периодических печатных изданиях материалы размещаются с сохранением указанного выше порядка публикации и учетом возможностей конкретного печатного издания. Согласование осуществляется лицами, уполномоченными Консультативным советом оппозиционных политических партий, представителями местных органов власти, учредителями и редакторами изданий.

РАЗРЕШЕНИЕ ВОЗМОЖНЫХ СПОРОВ

В случае возникновения споров между сторонами их разрешает Согласительная комиссия, которую составляют на паритетных началах эксперты от сторон и представители КНГ ОБСЕ.

Технические возможности подготовки материалов для телевидения и радио, а также для указанных государственных печатных изданий обеспечивает Информационный центр при КНГ ОБСЕ.

Народная Воля 12 ЛІСТАПАДА 1999 г.

Стоп-кадр

Вперед, к победе коммунизма!..

Фото IREX/ProMedia.

55 працэнтаў апытаных жыхароў Беларусі станоўча ставяцца да прыватызацыі аб'ектаў камунальнай уласнасці

Падчас сацыялагічнага апытання, праведзенага ў верасні-кастрычніку бягучага года ў 13 буйных прамысловых гарадах Беларусі пад эгідай Міжнароднай фінансавай карпарацыі, рэспандэнтам было прапанавана выказаць сваё стаўленне да прыватызацыі аб'ектаў рознічнага гандлю, бытавога абслугоўвання і грамадскага харчавання. На анкету адказалі 2857 жыхароў краіны.

Большасць апытаных — 55 працэнтаў — адзначылі сваё станоўчае стаўленне да прыватызацыі, 23 працэнты — адмоўнае. 22 працэнтам адказаўшых прыватызацыя аб'ектаў камунальнай уласнасці абыякавая.

Ацэньваючы функцыянаванне прыватнага сектару ў гандлі, грамадскім харчаванні і бытавым абслугоўванні, больш за палову рэспандэнтаў указалі: на змяненні ў лепшы бок у знешнім выглядзе прыватызаваных прадпрыемстваў (61 працэнт); на выкананне вонкавага рамонту (66 працэнтаў) і ўнутранай аддзелкі (69 працэнтаў); на больш зручны для кліентаў час працы (53 працэнты) і пашырэнне асартыменту ў прыватызаваных прадпрыемствах (57 працэнтаў).

Леанід ІГНАЦЬЕЎ.

Дзяржаўнае радыё парушае канстытуцыйныя правы грамадзян на атрыманне дакладнай інфармацыі?

Віцебскі абкам Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ) звярнуўся з запытам у абласны камітэт па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

Дзяржаўнае радыё, лічаць камуністы, парушыла права грамадзян на інфармацыю, аднабакова асвятліўшы прайшоўшы ў Віцебску мітынг з нагоды гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вядома, што і ў падрыхтоўцы, і ў правядзенні гэтага мерапрыемства мясцовая арганізацыя ПКБ удзельнічала нароўні з членамі Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ). Аднак у радыёрэпартажы пра мітынг слухачы не знайшлі нават узгадвання пра ПКБ. Між тым менавіта з трыбуны мітынгу сакратар абкама ПКБ Генадзь Хобатаў упершыню абнародаваў факт існавання на дзяржаўным узроўні плану ліквідацыі калектыўнай формы ўласнасці на зямлю — гэта, на думку камуністаў, лагічна выцякае з вынікаў рэферэндуму 1996 года.

Радыёслухачы, аднак, пра гэты факт не даведаліся. Такім чынам, лічаць у Віцебскім абкаме ПКБ, дзяржаўнае СМІ парушыла канстытуцыйнае права грамадзян на поўную, дакладную і своечасовую інфармацыю.

Леанід СІМАНАЎ.

Открытое письмо
министру внутренних дел Республики Беларусь генерал-лейтенанту
Ю.Л.СИВАКОВУ

И вот тогда я понял, что это — фашизм

Юрий Леонидович!

Вы уже попали в новейшую историю пока еще независимой Республики Беларусь. Возможно даже, Лукашенко Вас и пострадавших милиционеров наградит, но, выполнив преступный приказ и сотворив Кровавое воскресенье — 17 ОКТЯБРЯ, я думаю, Вы взяли на свою душу большой грех. Пройдет немного времени и родители как пострадавших участников митинга, так и родители пострадавших молодых милиционеров Вас проклянут, и, как Пиночет, Вы предстанете перед справедливым судом.

В 1990 году, когда я был командиром войсковой части на Кавказе, в Кабардино-Балкарии, меня вызвал президент этой республики Валерий Мухамедович Коков и спросил: "Будешь ли ты выполнять приказ из Москвы и разгонять мирные демонстрации, как это делалось в Тбилиси?" На что я ответил: "Нет. За время службы у меня появилось в этой республике много друзей и знакомых. И они могут оказаться в рядах демонстрантов. Вот если они с оружием окружат территорию, где дислоцируется моя воинская часть и ранят хоть одного солдата, тогда я отдам команду на открытие огня". И они митинговали днями и ночами при кострах. Но никто за две недели тогда в Нальчике не пострадал. Так ведь это для меня, белоруса, был чужой народ. Что же делаете Вы с нашим народом? Почему Вы так нас ненавидите? Вы же так долго здесь прожили и прослужили, начиная с Боровухи-1? Неужели в конце XX века вы думаете, что можно избивать, калечить людей только за то, что они имеют отличные от Вас представления о путях развития своего государства. Только за то, что они имеют другие представления о своей национальной культуре, языке и обустройстве своего будущего? Ну не хотим мы быть Российской губернией — так за это нас в тюрьму, бить и пытать?

Так зачем же Вы пошли на эту провокацию? Ведь сразу было понятно, что нельзя белорусский народ загнать в резервацию. Сегодня Вы разрешите собираться людям, не согласным с политикой Лукашенко, на площадке для выгула собак, а завтра вообще разрешите собраться где-нибудь вдалеке от г. Минска? Нет. Этого не будет!

Поэтому и пошел "Марш свободы" по центральной улице. И шли демонстранты мирно, без оружия, камней и палок. За те примерно пять километров, которые прошли демонстранты до места провокации тридцатитысячной колонной, не было повреждено ни одной витрины, ни одного киоска, не поцарапано ни одной автомашины. Ну дошли бы они до площади Независимости, помитинговали и разошлись.

Ведь именно так было 21 июля. Ведь тогда, наткнувшись на цепь омоновцев, колонна демонстрантов свернула на Октябрьскую площадь, помитинговала и разошлась. Так было бы и на этот раз...

Колонна отвернула от милицейского кордона и не пошла по ул. М.Богдановича. Затем колонна не поддалась на провокацию и не повернула на площадь Победы. Но вам нужна была слава **усмирителя народного восстания**, и Вы собрали около 3000 вооруженных до зубов обученных солдат, чтобы проучить инакомыслящих. Поэтому на улице Первомайской Вы подготовили провокацию, оказав, кстати, тем самым медвежью услугу Лукашенко. (Вот это как раз БТ и не показывает.) Когда от основной массы отрезали около 500 участников Марша с одной стороны автобусами с ОМОНОм и перекрыли мост через р. Свислочь омоновцами со щитами, прозвучала команда "К БОЮ". Команды захвата начали выхватывать участников Марша и избивать.

На нашу общую беду, в парке им. Горького делали новую дорожку к Ледовому дворцу, и там была сложена штабелями тротуарная плитка. Вот она-то и стала орудием защиты митингующих. Вот этого Вы и не предусмотрели. Не оппозиция же натаскала и складировала там плитку!

Кроме того, я констатирую, что на сегодняшний день Лукашенко, подобно Гитлеру в 1937 году, разогнав законный парламент, создал свой собственный "карманный" и свою систему безопасности, подобную гестапо, под названием ОМОН для уничтожения инакомыслящих и интеллигенции. Представители этих спецподразделений по зверствам и пыткам по отношению к своему народу полностью копируют гестапо. Мы, а это 62 человека, все это испытали на себе ночью 18 октября. Конкретно с нашей группой задержанных и находящихся в Партизанском РОВД в количестве 15 человек дело обстояло так.

В 6 часов утра в помещение Партизанского РОВД, где мы находились как задержанные в парке им. Горького до суда, ворвалось спецподразделение ОМОН и с криком "Руки за голову! В автобус!" начали избивать кулаками и дубинками, пропуская нас сквозь строй. Среди нас были две девушки, но и с ними обращались самым зверским образом. Полусонных людей избивали по одному. Причем били все 7 омоновцев сразу. После чего в проходе автобуса всех свалили один на одного и наверх забросили двух женщин. При этом продолжали бить по головам. Причем лично я заявил им, что являюсь журналистом газеты.

Омоновцы плевали, пытались мочиться и грозились мужчин "опустить" своими дубинками, а женщин изнасиловать. Когда внизу начали задыхаться, кричали, что сейчас вывезут в лес и закопают, как и всех оппозиционеров, всех, кто против Лукашенко.

Пока автобус ехал, они заставляли плачущих женщин громко петь песню "В траве сидел кузнечик". Мужчин, лежащих друг на друге, избитых и в самых неудобных позах заставляли подпевать. Нам невозможно было даже дышать. Они начали прыгать на лежащих в проходе автобуса ПАЗ людях. Тех, кто не мог петь, били дубинками. После удара по голове я на время потерял сознание. Омоновцы вытащили меня из груды тел, двое ломали руки, а третий толкал в горло и проворачивал там резиновую дубинку. Отпустили меня, думая, что уже задушили, когда я уже начал хрипеть. Меня били и пытали, хотя с моих слов им было известно, что я являюсь корреспондентом газеты "Гражданин и закон". После чего всех усадили на корточки и кричали, что нас всех вывезут за город и закопают. От женщин требовали показывать стриптиз, самым блатным жаргоном оскорбляли нас и всех оппозиционных политиков. Издевательствам подвергалась также молодая женщина Ольга Барьялай, 26 лет. Из сопроводительных документов омоновцам было известно, что у нее трое малолетних детей. Ее бросили на пол, а сверху на нее бросили троих мужчин. Били ногами по голове и требовали больше не ходить на митинги и демонстрации.

Когда я сказал, что знаю кое-кого из их начальства, они заорали, что и Сиваков для них никто. Они признают только Лукашенко. И вот тогда я понял, что это — фашизм. Что для меня было самое страшное, так это то, что среди них были офицеры. Такие по указанию всенародно избранного, не задумываясь, могли закопать и Захаренко, и Винникову, и Гончара с Красовским. Да и любого из нас.

Били нас всех и при сдаче в спецприемнике. Причем все, кому бы мы об этом ни заявляли, только усмехались и во внимание это не принимали. Даже судья Трубников, который рассматривал мое дело.

Извините, что пишу с опозданием, после выхода из тюрьмы. Всех митингующих с видимыми следами побоев постарались упрятать от общественности на 3—15 суток, тратя их в течение 5 минут на человека самым гуманным и справедливым судом без адвоката, защиты и прочих излишних формальностей. Задумайтесь, Юрий Леонидович, хотели бы Вы оказаться на моем месте?

Государственная пресса и телевидение в очередной раз в лучших геббельсовских традициях пытается расслоить общество. Но на самом деле все было не так, как они это преподносят.

Все потерпевшие обратились в прокуратуру, сняли побои в судмедэкспертизе, обратились также в различные правозащитные организации и Комиссию по пыткам при ООН.

Все мы требуем:

1. Назначить служебное расследование и выявить конкретных исполнителей пыток и издевательств при перевозке задержанных из Партизанского и других РОВД в спецприемник ночью и утром 18 октября 1999 года. Мы готовы участвовать в следственном эксперименте и присутствовать при опознании.

2. Прекратить в войсках политику вседозволенности и натаскивания спецподразделений для разгона демонстраций.

3. Требуем, чтобы Вы нашли в себе смелость и подали в отставку, учитывая то, что не предотвратили массового побоища. Требуем оградить нас от преследований со стороны Ваших карательных органов и спецслужб.

4. Известить общественность и пострадавших о результатах проведенной проверки и мерах, примененных к преступникам в погонах.

Владимир ЧЕРНОВ,
подполковник запаса.

P.S. Под письмом стоят также подписи многих из потерпевших.

Згодна з праектам бюджэту Беларусі на 2000 год, межавы дэфіцыт бюджэту складзе 102,8 мільярда рублёў

Расходы рэспубліканскага бюджэту ў 2000 годзе прадугледжваюцца ў памеры 1 339 205 150 тысяч рублёў, даходы — 1 236 353 436 тысяч рублёў. Гэта вынікае з праекта Закона аб бюджэце, які быў ухвалены на пасяджэнні Савета міністраў Беларусі 9 лістапада. Межавы памер дэфіцыту бюджэту плануецца зацвердзіць у суме 102 851 714 тысяч рублёў. Пакрыццё дэфіцыту будзе ажыццяўляцца ў асноўным за кошт крэдытаў Нацыянальнага банка (на агульную суму 75 875 887,5 тысячы).

Згодна з праектам, даходная частка рэспубліканскага бюджэту на 45,8 працэнта будзе сфарміраваная за кошт унутраных падаткаў на тавары і паслугі (у тым ліку падатку на дабаўленую вартасць, акцызаў, даходаў ад знешняга гандлю), на 16,7 працэнта — за кошт прамых падаткаў на даходы і прыбытак, на 15,7 працэнта — за кошт даходаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў).

Самы буйны артыкул расходнай часткі — "Іншыя расходы" — уключае ў сябе фінансавую дапамогу бюджэтам іншых узроўняў, фінансаванне выбараў і рэферэндумаў, рэзервовага фонду кіраўніка дзяржавы і некаторыя іншыя расходы. Ягоная ўдзельная вага ў агульнай долі бюджэтных расходаў прадугледжваецца ў памеры 17,6 працэнта. Доля расходаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў — каля 14 працэнтаў, расходаў на праваахоўную дзейнасць і забеспячэнне бяспекі — каля 8 працэнтаў, на капітальныя ўкладанні — 6,9 працэнта, ахову здароўя і фізічную культуру — 6,8 працэнта, папярэджанне і ліквідацыю наступстваў надзвычайных сітуацый і стыхійных бедстваў — 6,4 працэнта, адукацыю — 6 працэнтаў, сацыяльную палітыку — 5,7 працэнта, нацыянальную абарону — 4,7 працэнта, абслугоўванне дзяржаўнага доўгу — 4,7 працэнта, папаўненне дзяржаўных запасаў і рэзерваў — 3,5 працэнта, сельскую гаспадарку — 2,7 працэнта, дзяржаўнае крыванне і мясцовае самакіраванне — 2,6 працэнта, навуку — каля 2,5 працэнта, ахову навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў — 2,3 працэнта, прамысловасць, энергетыку і будаўнічы комплекс — 1,6 працэнта.

У грашова-крэдытнай палітыцы на 2000 год прадугледжваецца скарачэнне аб'ёмаў крэдытнай эмісіі, што, як чакаецца, станоўча паўплывае на заглушэнне інфляцыйных працэсаў. Як адзначалася на пасяджэнні Савета міністраў, крэдытаванне павінна быць пераразмеркавана на карысць прамысловага комплексу. У жыллёвым жа будаўніцтве і аграрным сектары, якія дагэтуль крэдытаваліся ў асноўным за кошт эмісіі, павінны быць адшуканыя іншыя крыніцы фінансавання. "Хопіць эмісійнага крэдытавання, таму што гэта наркотык для эканомікі", — заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Лінг.

У адпаведнасці з праектам бюджэту, памер прыросту дзяржаўнага ўнутранага доўгу не можа перавышаць 3 працэнты ад валавога ўнутранага прадукта. Ліміт знешняга дзяржаўнага доўгу на канец 2000 года плануецца ў памеры 2 мільярда долараў ЗША.

Праект Закона аб бюджэце пасля канчатковай дапрацоўкі яго ва ўрадзе падлягае зацвярджэнню дзвюма палатамі Нацыянальнага сходу. Пасля гэтага ён будзе накіраваны на разгляд кіраўніку дзяржавы.

Сяргей СНЕГІН, БелаПАН.

Конкурс

Міс Беларускай стальной магістралі

Беларуская чыгунка і Беларускі прафесійны саюз чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў абвясцілі аб правядзенні 3 снежня чарговага конкурсу прафесійнага майстэрства "Міс Беларускай стальной магістралі".

Конкурс праводзіцца раз у тры гады, яго мэта — папулярызацыя прафесіі "праваднік пасажырскіх вагонаў" сярод рабочай моладзі і навучэнцаў. Падчас конкурсу выяўляюцца лепшыя праваднікі Беларускай чыгункі, вызначаецца ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі сярод праваднікоў. Згодна з умовамі конкурсу, у ім удзельнічаюць пераможцы конкурсаў структурных падраздзяленняў БЧ ва ўзросце 20—27 гадоў, якія працуюць па сваёй прафесіі не менш за два гады і зарэкамендавалі сябе "як узорны праваднік з высокай культурай абслугоўвання пасажыраў".

